УДК 94(476)"1919–1939"

**К. Д. Ананька**
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы

# ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ БЕЛАРУСКІХ ГІМНАЗІЙ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1919–1939 ГГ.)[1]

У артыкуле на аснове аналізу беларускай і замежнай гістарыяграфіі разглядаецца праблема перыядызацыі функцыянавання беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. Беларускія гімназіі – установы сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання ў Заходняй Беларусі, створаныя або рэарганізаваныя беларускімі арганізацыямі і актывістамі з мэтай развіцця адукацыйнага працэсу і пашырэння нацыянальнай ідэнтычнасці.

Аўтар разгледзеў спробы беларускіх і замежных гісторыкаў вылучыць асноўныя перыяды культурна-асветніцкай дзейнасці беларусаў у Заходняй Беларусі, у прыватнасці развіццё сярэдне-адукацыйнай справы. З улікам унутраных і знешніх фактараў развіцця навучальных устаноў аўтарам распрацаваны ўласны падзел на перыяды, які складаецца з чатырох этапаў: этап фарміравання перадумоў і станаўлення беларускай нацыянальнай сярэдняй школы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ва ўмовах польска-савецкай вайны; этап уключэння беларускіх гімназій у польскую адукацыйную сістэму як прыватных устаноў сярэдняй адукацыі пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора 1921 г.; этап крызісных з'яў у дзейнасці беларускіх гімназій, звязаны з іх імклівай палітызацыяй; этап заканадаўчага адзяржаўлення гімназій, ліквідацыя польскімі ўладамі сярэдніх навучальных устаноў.

У заключэнні аўтар робіць выснову аб адсутнасці ў сучаснай гістарыяграфіі перыядызацыі дзейнасці беларускіх гімназій. На яго думку, раскрыццё дадзенай праблемы можа паўплываць на развіццё дыскурсу ў вывучэнні нацыянальна-культурнага аспекту гісторыі Заходняй Беларусі.

**Ключавыя словы:** перыядызацыя, беларускія гімназіі, Заходняя Беларусь, Польшча, міжваенны перыяд.

**Для цытавання:** Ананька К. Д. Перыядызацыя функцыянавання беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1919–1939) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2024. № 2 (287). С. 41–45.
DOI: 10.52065/2520-6885-2024-287-7.

**K. D. Ananka**
Yanka Kupala Grodno State University

# PERIODIZATION OF THE FUNCTIONING OF BELARUSIAN GYMNASIUMS IN WESTERN BELARUS (1919–1939)

The article analyses the Belarusian and foreign histories and discusses the problem of the transition of belarusian gymnasiums in the territory of Western Belarus in 1919–1939. Belarusian gymnasiums are institutions of common education with the belarusian language of instruction in Western Belarus, created or reorganised by belarusian organisations and activists in order to develop the educational process and promote national identity.

The author examines the attempts of belarusian and foreign historians to identify the basic stages of the cultural and secular belarusian life in Western Belarus, and the development of the national science. Based on the internal and external facts of the development of educational institutions, the author defines a proper division into periods, which consists of several stages: the stage of development of programmes and establishment of the belarusian national public school in the territory of Western Belarus under the conditions of the Polish-Soviet war; inclusion of belarusian gymnasiums into the polish educational system as independent institutions of traditional education after the conclusion of the Treaty of Riga in 1921; the stage of crisis in the life of belarusian gymnasiums, connected with their institutionalisation; the stage of the state reinforcement of grammar schools, the liquidation of educational institutions by the polish authorities.

In conclusion, the author makes a conclusion about the absence in the modern historiography of studies of the development of belarusian schools. In his opinion, the unravelling of this problem can lead to the development of a course in the study of the national and cultural aspect of the history of Western Belarus.

[1] Даследаванне выканана ў рамках праекта БРФФД Г24МП-012 «Беларускія гімназіі ў міжваенны перыяд: грамадска-палітычны і культурны аспекты».

**Keywords:** periodization, belarusian gymnasiums, Western Belarus, Poland, interwar period.

**For citation:** Ananka K. D. Periodization of the functioning of belarusian gymnasiums in Western Belarus (1919–1939). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2024, no. 2 (287), pp. 41–45 (In Belarusian).

DOI: 10.52065/2520-6885-2024-287-7.

**Уводзіны.** Перыядызацыя з'яўляецца важнай катэгорыяй навуковага пазнання, якая дазваляе паказаць дынамічнасць развіцця гістарычнай падзеі або з'явы. У некаторай ступені яна спрашчае тэарэтычнае разуменне, спрыяе падвядзенню вынікаў гістарычнага працэсу. Гісторык Бостан С. К., падкрэсліваючы неабходнасць выкарыстання новых падыходаў для пазнання сацыяльных праблем, назваў перыядызацыю «эфектыўным метадам упарадкавання і аналізу матэрыялу, на аснове якога можна глыбей паказаць суадносіны развіцця гістарычнага працэсу ў цэлым і асобных яго праяў, вылучыць на шкале часу тыя характэрныя яго перыяды, якія адлюстроўваюць самыя істотныя этапы сацыяльнага развіцця» [1, с. 180].

Распрацоўка перыядызцыі гістарычных з'яў і падзей уяўляе сабой важны кампанент метадалагічнай асновы. Вылучэннем перыядаў культурна-асветніцкай дзейнасці беларусаў, у тым ліку і арганізацыі школьніцтва, займаліся беларускія гісторыкі Вабішчэвіч А. М. [2], Загідулін А. М. [3], Крывуць В. І. [4] і Горны А. С. [5]. Сярод замежных даследаванняў па гэтай праблеме вылучаюцца працы польскіх гісторыкаў Маўэрсберга С. [6] і Гамулкі К. [7]. Аднак і ў беларускай, і ў польскай гістарыяграфіі перыяды функцыянавання беларускіх гімназій асобна не разглядаюцца, а толькі ў кантэксце развіцця адукацыі ў міжваеннай Заходняй Беларусі.

**Асноўная частка.** Пад беларускімі гімназіямі маюцца на ўвазе ўстановы сярэдняй адукацыі (сярэднія школы) з беларускай мовай навучання на тэрыторыі міжваеннай Заходняй Беларусі, якая пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. увайшла ў склад польскай дзяржавы. На працягу 1919–1939 гг. такія ўстановы працавалі ў Вільні, Навагрудку, Гродна, Гарадку, Нясвіжы, Радашковічах і Клецку. Яны фактычна сталі месцамі падрыхтоўкі нацыянальна арыентаванай моладзі і пашырэння беларускай ідэнтычнасці ва ўмовах палітыкі паланізацыі з боку польскіх уладаў.

Нягледзячы на шырокую ўвагу беларускіх даследчыкаў на розныя аспекты гісторыі Заходняй Беларусі, праблема арганізацыі, развіцця, функцыянавання і ліквідацыі беларускай сярэдняй адукацыі не была даследавана комплексна. Размежаванне на этапы развіцця беларускага школьніцтва ў міжваеннай Польшчы першымі сталі практыкаваць польскія гісторыкі. У 1968 г. выйшла манаграфічная праца даследчыка Маўэрсберга С., у якой разглядадася становішча пачатковай і сярэдняй адукацыі нацыянальных меншасцяў, у тым ліку і беларусаў. С. Маўэрсберг выдзеліў тры этапы развіцця беларускай школьнай адукацыі ў міжваеннай Польшчы: 1919–1923 гг. – ад заняцця польскімі войскамі Віленшчыны да прыняцця закона «Аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцяў», вядомы, «як закон Грабскага»; 1924–1929 гг. – этап дзеяння «закона Грабскага», пад уплывам якога адбывалася пераўтварэнне беларускіх школ у польска-беларускія ўстановы адукацыі («утраквізацыя»); 1930-я гг. – паступовая ліквідацыя беларускай адукацыі. Паводле меркавання даследчыка, утварэнню і функцыянаванню беларускіх школ на першым этапе спрыяла непаслядоўнасць польскіх уладаў, тэндэцыя лібералізму з чаргаваннем польскага шавінізму [7, s. 104].

Спасылаючыся на С. Маўэрсберга, гэтую ж перыядазцыю выкарыстоўвае ў сваёй працы беларускі гісторык Загідулін А. М. Даследуючы дзяржаўную палітыку Польшчы ў галіне беларускай адукацыі ў міжваенны перыяд, ён падкрэсліў, што ў другой палове 1930-х гг. польскія ўлады імкнуліся да максімальнага прававога абмежавання працы беларускіх школ, каб паставіць іх пад поўную залежнасць ад дзяржавы [3, с. 14, 21].

Польская даследчыца Гамулка К., вывучаючы культурна-асветніцкае і рэлігійнае жыццё беларусаў у міжваеннай Польшчы, вылучыла два этапы развіцця беларускага школьніцтва: першы – ад кастрычніка 1918 г. да ўключэння Сярэдняй Літвы ў склад Польшчы ў 1922 г.; другі – 1923–1939 гг. Даследчыца адзначыла, што на землях пад кантролем польскага Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх зямель і Часовай кіруючай камісіі Сярэдняй Літвы дзейнічалі прававыя нормы, якія ўлічвалі мясцовую спецыфіку, мнаганацыянальны склад насельніцтва і патрэбы асобных народаў. Другі перыяд К. Гамулка характарызуе як імкненне ўладаў да ўмацавання польскай дзяржавы і хуткай асіміляцыі беларусаў, спачатку дзяржаўнай, а потым нацыянальнай [8, s. 102–103].

У 1990-я гг. разам з працэсам станаўлення нацыянальнай беларускай гістарыяграфіі адбываўся высокі пад'ём да вывучэння гісторыкамі асобных аспектаў гісторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Адным з такіх стала праблема арганізацыі і развіцця беларускай нацыянальнай

школы ва ўмовах нацыянальнай і культурнай асіміляцыі. Пэўнае месца ў гэтым пытанні займалі ў тым ліку і беларускія гімназіі. Беларускі гісторык Вабішчэвіч А. М., вывучаючы праблемы і становішча нацыянальнай адукацыі ў Заходняй Беларусі, вылучыў два яе перыяды: 1920-я і 1930-я гг. Першы этап характарызуецца адноснай нармалізацыяй працы нешматлікіх беларускіх гімназій і пачатковых школ. У гэты час яшчэ абараняліся правы, арганізоўвалася вучэбна-метадычная і выхаваўчая праца, наладжвалася культурна-асветніцкая дзейнасць. У 1930-х гг. праводзілася мэтанакіраваная дзяржаўная палітыка польскіх уладаў па паланізацыі беларусаў, што абумовіла шлях на ліквідацыю беларускіх гімназій [2, с. 102].

Не менш важным пытаннем з'яўляецца вывучэнне заканадаўчай базы міжваеннай Польшчы і яе ўплыву на становішча беларускай адукацыі. Даследаваннем уплыву палітыкі польскіх уладаў на працэс развіцця сістэмы беларускіх школ у Заходняй Беларусі займаўся гісторык Крывуць В. І. Акцэнтуючы ўвагу на праблемах школьной сістэмы міжваеннай польскай дзяржавы, даследчык таксама ўмоўна вылучыў 1920-я і 1930-я гг. Амаль адразу пасля аднаўлення польскай дзяржавы кіруючыя колы ўзялі курс на асіміляцыю нацыянальных меншасцяў. Адным са значных дзеянняў стала прыняцце закона ад 31 ліпеня 1924 г., які павінен быў вырашыць моўнае і сацыяльнае пытанне на заходнебеларускіх землях, у тым ліку і ў рэгуляванні правілаў утварэння нацыянальных школ, а дакладней – выцясненне беларускай адукацыі. Канец 1920-х гг. даследчык звязвае з частковай лібералізацыяй адносна культурна-адукацыйных патрэбаў беларусаў, выкліканай палітычнай кан'юктурай пасля ўстанаўлення рэжыму Ю. Пілсудскага ў маі 1926 г. Аднак наступныя дзеянні «санацыйнага» ўраду прывялі да ліквідацыі беларускай адукацыі ў 1930-я гг, што стала парушэннем міжнародных абавязкаў і канстытуцыйных палажэнняў польскай дзяржавы. Гэта, у сваю чаргу, паўплывала на падзеі верасня 1939 г., калі, паводле меркавання В. І. Крывуця, беларускае насельніцтва фактычна з абыякавасцю ставілася да знішчэння Польшчы [4, с. 18, 21].

Сярод апошніх даследаванняў неабходна згадаць перыядызацыю гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., распрацаваную беларускім гісторыкам Горным А. С. Ён улічыў крытэрыі арганізацыйных напрамкаў, формаў барацьбы, палітыку польскіх уладаў і актыўнасць беларускіх дзеячаў у нацыянальным руху. Зыходзячы з гэтага даследчык прапанаваў наступную перыядызацыю: 1921–1927 гг. – фаза развіцця; 1928–1935 гг. – фаза крызісу; 1936–1939 гг. – фаза арганізацыйнага заняпаду. У рамках дадзенай перыядызацыі ўвага на гімназіі звяртаецца ў другі перыяд, калі была закрыта Радашковіцкая беларуская гімназія ў верасні 1928 г., а леварадыкальная дзейнасць вучняў іншых гімназій прывяла да іх масавых выгнанняў і арыштаў [5, с. 78–81].

Перыядызацыя беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі была складзена на аснове наступных крытэрыяў: 1) дзейнасць беларускіх актывістаў па арганізацыі ўласнага адукацыйнага працэсу; 2) палітыка польскіх уладаў у дачыненні да беларускіх сярэдніх школ; 3) дзейнасць педагагічнага складу і вучнёўскага кантынгенту. Абапіраючыся на гэтыя крытэрыі, можна вылучыць чатыры асноўныя перыяды функцыянавання беларускіх гімназій.

*1919–1921 гг. – этап фарміравання перадумоў і станаўлення беларускай нацыянальнай сярэдняй школы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ва ўмовах польска-савецкай вайны.* Карыстаючыся прававым становішчам, беларускія актывісты і структуры пачалі актыўную працу па арганізацыі ўласнай навучальнай сістэмы з 1919 г. Міністр асветы часовага літоўскага ўрада Біржышка М. 4 студзеня 1919 г. задаволіў просьбу Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны (БТДАВ) у адкрыцці Віленскай беларускай гімназіі, якая распачала сваю дзейнасць 1 лютага 1919 г. [8, с. 43; 9, с. 2–3]. З дазволу польскіх акупацыйных уладаў былі заснаваны Навагрудская, Нясвіжская, Гродзенская і Гарадоцкая гімназіі, для якіх узорам стала ўстанова ў Вільні.

*1921–1928 гг. – уключэнне беларускіх гімназій у польскую адукацыйную сістэму як прыватных устаноў сярэдняй адукацыі пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора.* У гэты час былі заснаваны беларускія гімназіі ў Радашковічах (1922 г.) і Клецку (1924 г.). Крытычным момантам з'яўлялася прыняцце Закона «Некаторыя палажэнні арганізацыі адукацыі» ад 31 ліпеня 1924 г., што, у сваю чаргу, стала паваротам да паланізацыі ў галіне адукацыі. Фактычна выкананне дадзенага закона ўскладніла адкрыццё школ на роднай мове на тэрыторыі Заходняй Беларусі, а ў пачатковых класах беларускіх школ і гімназій уводзілася абавязковае вывучэнне польскай мовы [10, s. 1112–1113].

Важнай з'явай гэтага этапу з'яўляецца майскі пераварот 1926 г. і наступная за ім спроба рэжыму Ю. Пілсудскага атрымаць лаяльнае стаўленне з боку беларускага насельніцтва. Для гэтага нават меркавалася падтрымка беларускай адукацыі [4, с. 18]. У 1927 г. рашэннем міністра Дабруцкага Г. першыя 3 класы Навагрудскай беларускай гімназіі атрымалі дзяржаўныя правы, як і ў польскіх школах. У 1928–1929 гг. гімназіі ў Навагрудку і Вільні атрымалі няпоўныя дзяржаўныя правы:

выпускнікі маглі здаваць «матуру», што давала магчымасць паступаць у польскія ўніверсітэты.

Адначасова ў гэты перыяд адбываецца палітызацыя беларускіх гімназій. Назіраецца ўдзел часткі гімназічнай моладзі і педагогаў у дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ) і Беларускай сялянска-рабочай грамады (БСРГ). Разгром БСРГ у 1927 г. моцна паўплываў на адносіны да польскіх уладаў і ўключэнне беларускіх сярэдніх школ ў палітычную павестку.

*1928–1931 гг. – этап крызісных з'яў у дзейнасці беларускіх гімназій, звязаны з іх імклівай палітызацыяй.* Польскія ўлады сталі непрыхільна ставіцца да беларускіх гімназій, бо лічылі, што Таварыства беларускай школы (ТБШ) праводзіць у іх падпольную выхаваўчую дзейнасць у камуністычным духу. 29 жніўня 1928 г. была забаронена дзейнасць Галоўнай управы ТБШ, а 31 жніўня польскія ўлады нечакана спынілі дзейнасць ТБШ у Радашковічах і адначасова зачынілі Радашковіцкую беларускую гімназію [11, арк. 8–10]. У 1930/1931 навучальным годзе пачаліся праблемы ў Клецкай гімназіі. Усе спробы беларускіх актывістаў дамовіцца з польскімі ўладамі не атрымалі поспехаў. У жніўні 1931 г. польская паліцыя правяла кампанію па раскрыцці і ліквідацыі падпольных камуністычных ячэек у сценах установы [2, с. 72]. Гэта і стала падставай для ліквідацыі Клецкай беларускай гімназіі. Прычым польскія ўлады ў гэты перыяд значна завышалі ўзровень радыкалізацыі гімназій і спрабавалі паказаць іх дэструктыўную антыдзяржаўную дзейнасць.

*1932–1939 гг. – этап заканадаўчага адзяржаўлення беларускіх гімназій у Вільні і Навагрудку, ліквідацыя польскімі ўладамі беларускіх сярэдніх навучальных устаноў.* У 1932 г. польскія ўлады ініцыявалі змены ў галіне адукацыі і правядзення так званай рэформы Я. Енджаевіча – міністра веравызнанняў публічнай асветы. Згодна з новым заканадаўчым актам ад 11 сакавіка 1932 г., усе навучальныя ўстановы незалежна ад іх статусу траплялі пад юрысдыкцыю і кіраванне міністэрства. Мясцовыя школьныя ўлады мелі поўнае права закрыць школу ў выпадку неадпаведнасці патрабаванням, нізкага навучальнага ўзроўню і нелаяльнасці да польскай дзяржавы [12, s. 545–546].

Ажыццяўленне рэформы абумовіла адзяржаўленне беларускіх гімназій. У 1932 г. гімназіі ў Вільні і Навагрудку былі пераведзены ў статус філіялаў дзяржаўных навучальных устаноў. У 1934 г. Навагрудская беларуская гімназія была зачынена. У другой палове 1930-х гг. барацьба за гімназіі і ўвогуле шырокая нацыянальная актыўнасць паступова прыходзілі ў заняпад, магчыма, па прычыне забароны і ліквідацыі Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГіК) і ТБШ, якія стараліся абараняць нацыянальныя інтарэсы ў асветніцкай справе. У 1939 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала толькі адна беларуская гімназія – у Вільні.

**Заключэнне.** У гістарычнай навуцы не існуе комплекснай перыядызацыі функцыянавання беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі. Улічваючы дасягенні беларускай і замежнай гістарыяграфіі, а таксама прымаючы пад увагу як знешнія, так і ўнутраныя фактары, аўтар прапанаваў перыядызацыю, якая падзяляе гісторыю беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі на чатыры этапы. Гэта дазваляе істотна паказаць ролю навучальных устаноў як адных з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў, якія фактычна сталі «фарпостамі» супрацьдзеяння палітыкі паланізацыі. Навуковае абмеркаванне дадзенай перыядызацыі патэнцыйна можа паўплываць на пераасэнсаванне і ўдакладненне ў вывучэнні грамадска-культурнага аспекту гісторыі Заходняй Беларусі.

## Спіс літаратуры


1. Бостан С. К., Бостан Л. Н. К вопросу о периодизации всеобщей истории государства и права: традиции и новации в подходах // Историко-правовые проблемы: новый ракурс. 2011. № 4. С. 180–194.
2. Вабішчэвіч А. М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). Брэст: Выд-ва БрДУ, 2004. 116 с.
3. Загідулін А. М. Дзяржаўная палітыка Польшчы ў галіне беларускай адукацыі // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэма імя Янкі Купалы. Сер. 1, Гуманітарныя навукі. 2005. № 2. С. 13–22.
4. Кривуть В. И. Польские власти и белорусские школы на территории Западной Беларуси в межвоенный период // Традиционные национально-культурные и духовные ценности как фундамент инновационного развития России. 2020. № 2. С. 18–21.
5. Горны А. С. Перыядызацыя беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі (1921–1939) // Беларуская думка. 2020. № 9. С. 75–82.
6. Mauersberg S. Szkolnictwo powszechne dla mniejszości narodowych w Polsce w latach 1918–1939. Wrocław; Warszawa: Ossolineum Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1968. 230 s.
7. Gomółka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej // Zeszyty Naukowe Politechniki Gdańskiej. Ekonomia. 1992. № 31. S. 3–178.
8. Адамковіч А. Беларусы ў Літве: учора і сёння. Кніга 1. Вільня. Вільня: Таварыства беларускай культуры ў Літве, 2010. 200 с.

9. 1-я Віленская Беларуская Гімназія // Наша думка. 1921. № 21. С. 2–3.
10. Ustawa z dnia 31 lipca 1924 r. zawierająca niektóre postanowienia o organizacji szkolnictwa // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. 1924. № 79. S. 1212–1214.
11. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 941.
12. Ustawa z dnia 11 marca 1932 r. o prywatnych szkołach oraz zakładach naukowych i wychowawczych // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. 1932. № 33. S. 545–546.

## References

1. Bostan S. K., Bostan L. N. On the issue of periodization of the universal history of State and law: traditions and innovations in approaches. *Istoriko-pravovyye problemy: novyy rakurs* [Historical and legal problems: a new perspective], 2011, no. 4, pp. 180–194 (In Russian).
2. Vabishchevich A. M. *Asveta u Zakhodnyay Belarusi (1921–1939 gg.)* [Education in Western Belarus (1921–1939)]. Brest, BrSU Publ., 2004. 116 p. (In Belarusian).
3. Zagidulin A. M. State policy of Poland in the field of belarusian education. *Vesnik Grodzenskaga dzyarzhaunaga universitema imya Janki Kupaly. Seryya 1, Gumanitarnyya navuki* [Bulletin of the Yanka Kupala State University of Grodno. Ser. 1, Humanities], 2005, no. 2, pp. 13–22 (In Belarusian).
4. Krivut' V. I. Polish authorities and belarusian schools in Western Belarus during the interwar period. *Traditsionnyye natsional'no-kul'turnyye i dukhovnyye tsennosti kak fundament innovatsionnogo razvitiya Rossii* [Traditional national cultural and spiritual values as the foundation of Russia's innovative development], 2020, no. 2, pp. 18–21 (In Russian).
5. Gorny A. S. Periodization of the belarusian national movement in Western Belarus (1921–1939). *Belaruskaya dumka* [Belarusian thought], 2020, no. 9, pp. 75–82 (In Belarusian).
6. Mauersberg S. *Szkolnictwo powszechne dla mniejszości narodowych w Polsce w latach 1918–1939* [Universal education for national minorities in Poland in the 1918–1939]. Wroclaw; Warsaw, Ossolineum Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk Publ., 1968, 230 p. (In Polish).
7. Gomółka K. Belarusians in the Second Polish Republic. *Zeszyty Naukowe Politechniki Gdańskiej. Ekonomia* [Scientific Notebooks Of Gdańsk University Of Technology. Economics], 1992, no. 31, pp. 3–178 (In Polish).
8. Adamkovich A. *Belarusy u Litve: uchora i syonnya. Kniga 1. Vil'nya* [Belarusians in Lithuania: yesterday and today. Book 1. Vilnius]. Vilnius, Tavarystva belaruskay kul'tury u Litve Publ., 2010. 200 p. (In Belarusian).
9. 1-st Vilna Belarusian Gymnasium. *Nasha dumka* [Our opinion], 1921, no. 21, pp. 2–3 (In Belarusian).
10. Act of 31 July 1924 containing some provisions on the organisation of Education. *Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej* [Journal of Laws of the Republic of Poland], 1924, no. 79, pp. 1212–1214. (In Polish).
11. *Dzyarzhauny arkhiu Bresstkay voblasti* [The State Archive of the Brest region]. Fund 67. l. 1. F. 941.
12. Act of 11 March 1932 on private schools and scientific and educational establishments. *Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej* [Journal of Laws of the Republic of Poland], 1932, no. 33, pp. 545–546. (In Polish).

## Інфармацыя пра аўтара

**Ананька Кірыл Дзмітрыевіч** – аспірант Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, Рэспубліка Беларусь); настаўнік гісторыі ДУА "Гімназія № 7 імя В. Ц. Калакольнікава г. Гродна". E-mail: kirixan@yandex.ru

## Information about the author

**Ananka Kiryl Dzmitryevich** – postgraduate student, Yanka Kupala Grodno State University (22, Azheshka str., 230023, Hrodna, Republic of Belarus)); history teacher at Gymnasium № 7 named after V. T. Kolokolnikov. E-mail: kirixan@yandex.ru

*Паступіў 12.09.2024*